# Сітуацыя напярэдадні выбараў*2024. Першая справаздача кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”

*Экспертная місія па маніторынгу выбараў*2024 ажыццяўляецца Беларускім Хельсінкскім Камітэтам і праваабарончым цэнтрам «Вясна» ў межах кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».*

## ВЫСНОВЫ:

Выбары*2024[1] у Беларусі пачынаюцца ва ўмовах бесперапынных рэпрэсій; ва ўмовах фактычнай адсутнасці свабоды выказвання меркавання, мірных сходаў і асацыяцый; у атмасферы татальнага страху і ў зачышчаным палітычным полі. Пасля поствыбарчага крызісу 2020 года і канстытуцыйных зменаў 2022 года адбыліся істотныя змены ў прававым рэгуляванні выбараў. Гэтыя змены накіраваныя на зніжэнне ролі парламента, звужэнне кола ўдзельнікаў электаральных працэсаў, абмежаванне выбарчых правоў грамадзян і павышэнне кантролю ўладаў над выбарчым працэсам. Змены ў прававым рэгуляванні выбараў у Беларусі робяць іх на практыцы несвабоднымі і несправядлівымі. На ўзроўні правапрымянення і адміністрацыйнай практыкі, працягваюцца рэпрэсіі супраць любых праяваў таго, што ўспрымаецца ўладамі як палітычныя актыўнасці, ліквідаваныя незалежныя СМІ і практычна ўсе арганізацыі грамадзянскай супольнасці, асабліва праваабарончыя. Сродкі прававой абароны, што існуюць, па-ранейшаму неэфектыўныя; адсутнічаюць гарантыі незалежнасці судоў, прадказальнасць ў правапрымяняльнай

[1] "Выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі-2024 выкарыстоўваецца кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі ў поўнай меры рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцыяў, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае

практыцы. Усё гэта ўжо дазваляе канстатаваць немагчымасць для грамадзян рэалізаваць свае выбарчыя правы.

## ПРАВАВАЯ АСНОВА

Змяненні і дапаўненні ў **Канстытуцыю**, прынятыя на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года[2], у ліку іншага, трансфармавалі сістэму цэнтральных органаў улады. Згодна з новай рэдакцыяй Канстытуцыі, статус вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя Рэспублікі Беларусь нададзены[3] Ўсебеларускаму народнаму сходу (УНС), што не абіраецца народам наўпрост. Пры гэтым парламент становіцца прадстаўнічым і заканадаўчым органам[4]. УНС перададзена частка паўнамоцтваў парламента, акрамя таго, ёсць перадумовы для значнага кантролю УНС дзеючым прэзідэнтам, што дадаткова аслабляе[5] парламент, робіць і без таго ўразлівую[6] сістэму стрымак і проціваг цалкам дысфункцыянальнай. У абноўленай сістэме выбары дэпутатаў ніжняй палаты парламента ператвараюцца шмат у чым у падрыхтоўку да фармавання УНС. З пункту гледжання выбарчага працэсу, правамоцтва УНС прымаць рашэнне аб нелегітымнасці выбараў[7], здольнае прывесці да прызнання электаральнага мерапрыемства несапраўдным і прызначэнню новых выбараў, толькі дадаткова падрывае давер да іх, а адсутнасць дакладных крытэрыяў "легітымнасці" пазбаўляе існае рэгуляванне выразнасці і прадказальнасці.

У цэлым, рэгулятыўныя меры дзяржавы не толькі не прывялі да ліквідацыі фактараў, што пацягнулі поствыбарчы крызіс у жніўні 2020 года, але пагоршылі сітуацыю з пункта гледжання адпаведнасці выбарчага заканадаўства міжнародным стандартам свабодных і справядлівых выбараў.

Акрамя канстытуцыйнай змены канфігурацыі цэнтральных органаў дзяржаўнай улады, заканадаўчыя змены ў значнай ступені звузілі кола

[2] Гл. ацэнкі працэсу правядзення рэферэндуму і зменаў кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" https://referendum2022.spring96.org/be
[3] Арт. 89-1 Канстытуцыі
[4] Арт. 90 Канстытуцыі
[5] https://venice.coe.int/webforms/documents/?pdf=CDL-AD(2022)035-e
[6] https://www.venice.coe.int/webforms/documents/default.aspx?pdffile=CDL-AD(2022)008-e
[7] Гл. арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь ад 07.02.2023 N 248-З "Аб Усебеларускім народным сходзе"

актараў, што могуць удзельнічаць у электаральных працэсах у цяперашняй сітуацыі.

Змены ў **рэгуляванні дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў**[8], якія ўключаюць, сярод іншага, патрабаванні перарэгістрацыі палітычных партый, а таксама пагаршэнне ўмоў дзейнасці іншых грамадскіх аб'яднанняў, на практыцы маюць вынікам радыкальную трансфармацыю беларускага палітычнага поля і некамерцыйнага сектара: з 16 партый у статусе зарэгістраваных (а значыць, упаўнаважаных вылучаць сваіх кандыдатаў у дэпутаты) засталося ўсяго 4[9]. Скарачаецца колькасць грамадскіх аб'яднанняў, прадстаўнікі якіх могуць быць назіральнікамі, удзельнічаць у дзейнасці выбарчых камісій, уваходзіць у склад (дастасавальна да рэспубліканскіх аб'яднанняў) УНС[10]. Варта адзначыць, што новая рэдакцыя Канстытуцыі таксама пазбаўляе грамадскія аб'яднанні права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты, пакідаючы яго толькі палітычным партыям[11], працоўным калектывам і грамадзянам.

У развіцці новых канстытуцыйных палажэнняў значныя змены адчуў **Выбарчы кодэкс**. Пры гэтым унесеныя змены і дапаўненні ў цэлым не толькі не ўлічваюць ключавыя рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ[12], нацыянальных і міжнародных назіральнікаў[13], але наадварот, закладваюць прававую аснову для практычнай немагчымасці правядзення электаральных кампаній у адпаведнасці з абавязальніцтвамі Беларусі ў рамках АБСЕ ды іншымі міжнароднымі стандартамі.

---

[8] Гл. Закон Рэспублікі Беларусь от 14.02.2023 N 251-З "Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў"

[9] Lawtrend, Мониторинг НКО в Беларуси, находящихся в процессе принудительной ликвидации и принявших решение о самоликвидации. https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/situatsiya-so-svobodoj-assotsiatsij-i-organizatsiyami-grazhdanskogo-obshhestva-respubliki-belarus-obzor-za-sentyabr-2023-g

[10] Гл. Закон Рэспублікі Беларусь № 251-З “Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў”, Закон “Аб асновах грамадзянскага грамадства”; https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/pravovoe-regulirovanie-nko/novoe-v-zakonodatelstve/zakon-ob-obshhestvennyh-obedineniyah-osnovnye-izmeneniya

[11] Фармальна, Канстытуцыя захоўвае палітычныя партыі часткай грамадскіх аб'яднанняў (арт. 5), але змененая арт. 69 цяпер наўпрост паказвае, што права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты належыць палітычным партыям (але не грамадскім аб'яднанням).

[12]Рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ даступныя ў Базе рэкамендацый па выбарах https://paragraph25.odihr.pl/search?dayOfElection=2019-11-17T00%3A00%3A00.000Z&numberOfTheRecommendationInTheFinalReport=1&numberOfTheRecommendationInTheFinalReport=55&projectBeneficiary=Belarus&typeOfElection=Parliamentary&yearOfElection=2019&yearOfElection=2019

[13] https://referendum2022.spring96.org/ru/news/107870

Існае рэгуляванне не дазваляе праводзіць сапраўды ўсеагульныя выбары. Актыўнага і пасіўнага выбарчага права пазбаўленыя не толькі недзеяздольныя грамадзяне, але і асобы, што змяшчаюцца па выраку суда ў месцах пазбаўлення волі. У якасці пазітыўнага прыкладу варта паказаць, што асобы, якія ўтрымліваюцца пад вартай, у адпаведнасці з новай рэдакцыяй арт. 64 Канстытуцыі, здабылі актыўнае выбарчае права. Аднак, выключэнне з Выбарчага кодэкса палажэнняў, якія рэгулююць магчымасць галасавання за межамі Рэспублікі Беларусь, сведчыць аб заканадаўчым замацаванні непраемернай практыкі, якая мела месца ў 2022 годзе, што пазбавіла беларусаў за мяжой магчымасці галасаваць на рэферэндуме[14]; дэ-факта, грамадзяне, што цяпер знаходзяцца за мяжой, не могуць удзельнічаць у беларускіх электаральных мерапрыемствах, калі яны абмежаваныя ў сваёй свабодзе перамяшчэння праз рызыку пераследу.

Вялікае кола асобаў закранаюць абмежаванні пасіўнага выбарчага права. Так, права быць кандыдатамі цяпер пазбаўленыя грамадзяне, якія маюць грамадзянства іншай дзяржавы або "дакументы замежных дзяржаў, што прадстаўляюць правы на льготы і перавагі ў сувязі з палітычнымі, рэлігійнымі поглядамі або нацыянальнай прыналежнасцю". Таксама кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў не могуць быць грамадзяне, у дачыненні да якіх маецца абвінаваўчы прысуд суда, што набыў законную моц. Не могуць быць кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых Саветаў грамадзяне, якія маюць не знятую або непагашаную судзімасць. Абмежаванні закранулі і права быць нацыянальным назіральнікам, яно распаўсюджваецца толькі на асобаў, што валодаюць выбарчым правам. У любым выпадку, існае рэгуляванне доступу назіральнікаў да электаральных мерапрыемстваў і працэдур з'яўляецца недастатковым для забеспячэння празрыстасці і галоснасці выбараў.

Дзеючы механізм фармавання Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК) па-ранейшаму не з'яўляецца зразумелым і інклюзіўным, не забяспечвае гарантыі яе незалежнасці і бесстароннасці[15]. У абноўленым Выбарчым кодэксе адсутнічаюць палажэнні, што забяспечваюць практычную рэалізацыю прынцыпу галоснасці ў дзейнасці ЦВК, які дэкларуецца: інфармаванне выбаршчыкаў у цэлым зведзена да "ходу падрыхтоўкі і

[14] https://referendum2022.spring96.org/ru/news/106625
[15] https://referendum2022.spring96.org/ru/news/107870

правядзення выбараў"[16]. Новая рэдакцыя кодэкса не забяспечвае[17] грамадзянам практычную магчымасць быць дасведчанымі аб пайменным складзе выбарчых камісій, што дадаткова спрыяе зніжэнню даверу да выбарчага працэсу і з'яўляецца нарматыўным замацаваннем неправамернай практыкі 2022 года[18].

Выбарчы кодэкс дадаткова абмяжоўвае магчымасці фінансавання расходаў на падрыхтоўку і правядзенне выбараў не толькі для замежных дзяржаў і арганізацыяў, замежных грамадзян, але і арганізацыяў, што атрымліваюць замежную бязвыплатную дапамогу (уключна з пераводамі ад грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца за межамі краіны больш за 183 дні ў годзе).

У адпаведнасці са зменамі ў выбарчым заканадаўстве, выбары*2024 ужо мяркуюць сумяшчэнне дзвюх кампаній — правядзенне выбараў* дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў восьмага склікання і дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання ў адзіны дзень галасавання ў апошнюю нядзелю лютага. Прывязка электаральных мерапрыемстваў да адзінага дня галасавання, у прыватнасці, стварае падставы для патэнцыйнай няроўнасці дэпутатаў[19]. Акрамя таго, сумяшчэнне кампаній мае на ўвазе выкарыстанне агульных выбарчых камісій і ўчасткаў для галасавання. Так, выбаршчык у сельскай мясцовасці атрымае адначасова чатыры бюлетэні: па выбарах* дэпутатаў у сельскі савет, па выбарах* дэпутатаў у раённы Савет дэпутатаў, па выбарах* дэпутатаў абласнога Савета дэпутатаў і па выбарах* дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў[20]. Такім чынам выбудоўваецца сістэма, якая можа быць празмерна груваcткай для выбаршчыкаў, асабліва ў адсутнасць адэкватнай асветы і магчымасцяў для агітацыі.

Сярод змяненняў у Выбарчым кодэксе ёсць меры, якія сутнасна выконваюць рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ, у прыватнасці, датэрміновае галасаванне цяпер ажыццяўляецца з 12 да 19 гадзін без перапынкаў[21]; уключэнне грамадзян у спісы выбаршчыкаў ажыццяўляецца да дня

---

[16] арт. 13 Выбарчага кодекса
[17] Параўн. рэдакцыі арт. 34 ВК.
[18] https://referendum2022.spring96.org/ru/news/106837
[19] У выпадку роспуску Палаты прадстаўнікоў, абраны на пазачарговых выбарах склад дэпутатаў ажыццяўляе свае паўнамоцтвы толькі да чарговага адзінага дня галасавання, на якім абіраецца новы склад Палаты, г. зн. тэрмін іх паўнамоцтваў можа быць значна карацейшы за поўны пяцігадовы перыяд (гл. арт. 56 Выбарчага кодэкса)
[20] https://news.zerkalo.io/economics/54422.html?c
[21] Арт. 53 ВК

галасавання[22]; заканадаўча замацаваны пазітыўны абавязак ЦВК, участковых камісій ствараць дадатковыя ўмовы для грамадзян з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі[23]. Гэтыя пазітыўныя меры, аднак, не здольныя кардынальна змяніць агульную сітуацыю неадпаведнасці заканадаўства міжнародным стандартам.

Выбарчы кодэкс захоўвае найбольш спрэчныя працэдуры, уключна з датэрміновым галасаваннем і непразрыстай працэдурай падліку галасоў. Заканадаўча афармленая забарона на фатаграфаванне бюлетэняў. Толькі цяпер пры недастатковай яўцы можа быць прызнана, што выбары прэзідэнта не адбыліся.

Агулам, прававая рамка напярэдадні выбараў*2024 легалізуе мноства **рэпрэсіўных інструментаў**, якія выкарыстоўваюцца ўладамі для стварэння атмасферы страху і немагчымасці рэалізацыі грамадзянамі законных правоў і свабод. Так, у 2021 годзе ў заканадаўства ўнесеныя змены, што пашырылі і зрабілі больш жорсткай адказнасць за рознага роду пратэсную актыўнасць[24]. У 2022 годзе быў уведзены шэраг змяненняў у антыэкстрэмісцкае і крымінальнае заканадаўства, якія ўводзяць смяротнае пакаранне за здраду дзяржаве, крымінальную адказнасць за ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай грамадскай арганізацыі, магчымасць завочнага крымінальнага пераследу, асуджэння і пазбаўлення грамадзянства тых, хто з'ехаў, вядзенне публічных спісаў датычных да экстрэмізму людзей, а таксама дэнансацыю Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах[25]. Захоўваюць сваё дзеянне нормы антыэкстрэмісцкага заканадаўства, што перашкаджаюць рэалізацыі свабоды выказвання меркаванняў і свабоды асацыяцый[26], рэгуляванне масавых сходаў, якое супярэчыць міжнародным стандартам, заканадаўчая рамка, што стварае практычную немагчымасць для дзейнасці незалежных СМІ ў межах юрысдыкцыі дзяржавы[27], сістэмная адсутнасць гарантыі

---

[22] Арт. 21 ВК
[23] Арт. 33, 44 ВК
[24] Вясна, Змены ў заканадаўстве Беларусі. Узаконеныя рэпрэсіі перыяду крызісу правоў чалавека 2020-2021 гг.
[25] Вясна, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2022 годзе: https://spring96.org/be/news/110467
[26] Доклад миссии ОБСЕ по установлению фактов в Беларуси о серьезной угрозе человеческому измерению ОБСЕ в Беларуси с 5 ноября 2020 года: https://www.osce.org/files/f/documents/b/8/543246.pdf
[27] Белорусская ассоциация журналистов, Беларусь 2022-2023. Права человека. Гражданское общество. Медиа: https://baj.by/ru/analytics/doklad-bazh-belarus-2022-2023-prava-cheloveka-grazhdanskoe-obshchestvo-media

справядлівага судовага разбору незалежным судом[28], што ў сукупнасці[29] пазбаўляе грамадзян і ключавых палітычных актараў магчымасці паўнавартасна і эфектыўна ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі.

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

Выбары*2024 арганізуюцца на фоне глыбокага грамадска-палітычнага крызісу, які доўжыцца больш за 3 гады і пачаўся ў 2020 годзе, у сувязі з узмацненнем рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці ў перыяд выбарчай кампаніі[30] і фальсіфікацыяй вынікаў прэзідэнцкіх выбараў 2020 года.[31] За абвяшчэннем афіцыйных вынікаў выбараў 2020 года, што не адлюстравалі рэальнае волевыяўленне грамадзян,[32] рушылі ўслед масавыя стыхійныя мірныя пратэсты, у адказ на якія ўлады пачалі сілавыя разгоны пратэстаў, масавыя затрыманні і катаванні пратэстоўцаў.[33] У дачыненні да ўдзельнікаў мірных пратэстаў следчыя органы пачалі заводзіць крымінальныя справы па абвінавачванні ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо ў масавых беспарадках.[34]

Перыядычна практыкаваны ўвесь аўтарытарны перыяд **крымінальны пераслед па палітычных матывах**, узмацніўся ў перыяд прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, захоўваецца на рэпрэсіўным узроўні да сённяшняга дня і працягнецца ў агляднай будучыні. Узбуджэнне крымінальных справаў па палітычных матывах з'яўляецца асноўным метадам рэпрэсіўнага задушэння любой няўхваленай уладамі актыўнасці: у параўнанні з канцом 2020 года

---

[28] Доклад спецдокладчика ООН по Беларуси, 3 мая 2023, A/HRC/53/53: https://undocs.org/Home/Mobile?FinalSymbol=A/HRC/53/53&Language=E&DeviceType=Desktop&LangRequested=False

[29] https://index.belhelcom.org/

[30] Больш падрабязны аналіз у папярэдняй аналітычнай справаздачы па выніках назірання: https://elections2020.spring96.org/be

[31] Абгрунтаванне неадпаведнасці абвешчаных вынікаў прэзідэнцкіх выбараў рэальнаму волевыяўленню грамадзян гл. у выніковай аналітычнай справаздачы па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года: https://elections2020.spring96.org/be

[32] Выніковая аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года, с. 3: https://elections2020.spring96.org/be

[33] За першыя тры дні паслявыбарчых пратэстаў было затрымана больш за 6 000 чалавек, цягам жніўня 2020 года – больш за 7 500, а цягам 2020 года – больш за 31 000 чалавек. У жніўні 2021 года Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь паведаміў, што ў другой палове 2020 года яму паступіла каля 5 000 скаргаў на меркаванае жорсткае абыходжанне, і ўсе яны былі адхіленыя. Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2020 годзе: https://spring96.org/be/news/101214

[34] Amnesty Eurasia, Белорусские власти возбудили массовые уголовные дела против сотен мирных демонстрантов: https://eurasia.amnesty.org/2020/11/03/massovye-ugolovnye-dela-protiv-soten-mirnyh-demonstrantov-v-belarusi/

колькасць вядомых крымінальных справаў па палітычных матывах вырасла ў 5 разоў. У канцы 2020 года ПЦ "Вясна" было вядома пра 650 чалавек, у дачыненні да якіх распачатая крымінальная справа ў сувязі з іх грамадскай і палітычнай актыўнасцю, 1 380 – у канцы 2021 года, 3 800 – у канцы 2022 года і 5 200 на 20.11.2023.[35] Найбольш распаўсюджанымі крымінальнымі артыкуламі, па якіх людзі прыцягваюцца да адказнасці з элементам палітычнага пераследу, з'яўляюцца арт. 342 КК: арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх; дыфамацыйныя артыкулы 368 і 369 КК: абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і абраза прадстаўніка ўлады; і арт. 130 КК: распальванне варожасці і варажнечы. Па дадзеных уладаў, у канцы 2020 года было ўзбуджана больш за 900 крымінальных справаў за ўдзел у пратэстах;[36] у канцы 2021 – больш за 5 000. Справы, звязаныя з "экстрэмісцкай, пратэснай актыўнасцю", склалі тады 5,5% ад агульнага масіва крымінальных справаў, пры гэтым "з рэальным ужываннем гвалту здзейснена менш за 3% злачынстваў гэтай катэгорыі".[37] У ліпені 2022 года 11 000 справаў,[38] у лістападзе 2023 — 16 000 справаў[39].

На момант прызначэння выбараў*2024 прызнаныя палітычнымі зняволенымі 1 444 людзей, пазбаўленых волі ў сувязі з узбуджэннем крымінальнай справы.[40]

Выбары*2024 абвешчаныя ў створаных уладамі ўмовах татальнага страху за жыццё і здароўе. Адміністрацыйны і крымінальны працэсы не адпавядаюць стандартам справядлівай судовай працэдуры, а выкананне пакарання па палітычна матываваных справах адбываецца **з ужываннем катаванняў і жорсткага, бесчалавечнага і зневажальнага чалавечай годнасці абыходжання**. Улады не проста не абараняюць ад катаванняў, але сістэмна самі іх ужываюць. Фактычна, любое ўзаемадзеянне прадстаўніка ўлады і чалавека, што з'яўляецца апанентам улады або разглядаецца як такі,

[35] Вясна, Спіс фігурантаў па крымінальных справах (абнаўляецца)]: https://spring96.org/be/news/99638
[36] Вясна, сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2020: https://spring96.org/be/news/100742
[37] Вясна, Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў 2020 годзе. Аналітычны агляд: https://spring96.org/be/news/101214
[38] Тэлеграм-канал Следчага камітэта Беларуси: https://t.me/skgovby/7971
[39] Афіцыйны сайт Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь: https://www.prokuratura.gov.by/ru/media/novosti/mezhdunarodnoe-sotrudnichestvo/generalnyy-prokuror-shos/
[40] Вясна, Спіс палітычных зняволеных [абнаўляецца]: https://prisoners.spring96.org/be

адбываецца не ў межах закона, захавання правоў чалавека і гуманнага абыходжання, а ва ўмовах гвалту, прыніжэння і пакутаў.

Вядома пра, як мінімум, пра 7 смерцяў, што, як мяркуецца, наступілі ў выніку неапраўданага або несуразмернага ўжывання ўладамі сілы і катаванняў — Аляксандр Тарайкоўскі, Аляксандр Віхор, Генадзь Шутаў, Раман Бандарэнка і Вітольд Ашурак,[41] Алесь Пушкін[42] і Мікалай Клімовіч.[43]

**Свабода слова ў Беларусі адсутнічае** не толькі на ўзроўні асобнага чалавека, але і ў **дачыненні да медыясектара Беларусі**. З 2020 года шырокамаштабнымі метадамі ціску на СМІ і журналістаў сталі крымінальны пераслед журналістаў (вядома пра 15 крымінальных справаў за 2020 год,[44] 60 крымінальных справаў – за 2021,[45] 17 крымінальных справаў – за 2022[46]), перашкода дзейнасці СМІ з боку сілавых ведамстваў, ужыванне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму для абмежавання ўплыву незалежных медыя і адміністрацыйныя меры па абмежаванні доступу да інфармацыі. Пад забаронай любая незалежная інфармацыя, звязаная з шырокім колам пытанняў: ад грамадска-палітычнай сферы да культуры і беларускамоўнага кантэнту. Парушэнне забаронаў цягне для людзей пераслед у розных формах: жорсткае абыходжанне і катаванні, штраф, канфіскацыя маёмасці, адміністрацыйны арышт і крымінальны пераслед, прымусовае псіхіятрычнае лячэнне, пагрозы пазбаўлення грамадзянства.[47]

Адна з найважнейшых формаў удзелу ў жыцці дзяржавы і грамадства рэалізуецца людзьмі праз арганізацыі грамадзянскай супольнасці, пры гэтым на дзяржаве ляжыць абавязак стварыць умовы для паўнавартаснага функцыянавання арганізацый грамадзянскай супольнасці. Аднак пасля крызісу 2020 года ўлады распачалі шэраг дзеянняў **па зачыстцы**

---

[41] Доклад Верховного комиссара ООН по правам человека, A/HRC/52/68, п. 12: https://undocs.org/Home/Mobile?FinalSymbol=A%2FHRC%2F52%2F68&Language=E&DeviceType=Desktop&LangRequested=False

[42] Вясна, Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін: https://spring96.org/be/news/112174

[43] Вясна, у калоніі памёр палітвязень Мікалай Клімовіч: https://spring96.org/be/news/111633

[44] Белорусская ассоциация журналистов, Ситуация в сфере СМИ в 2020 г.: https://baj.media/sites/default/files/analytics/files/2021/media-monitoring-2020-ru.pdf

[45] Белорусская ассоциация журналистов, СМИ в Беларуси в 2021 году: https://baj.media/ru/analytics/smi-v-belarusi-v-2021-godu-0

[46] Белорусская ассоциация журналистов, СМИ в Беларуси в 2022 году: https://baj.media/ru/analytics/smi-v-belarusi-v-2022-godu-0

[47] Вясна, Даклад "Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў на падставе барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам": https://spring96.org/files/book/be/abmezhavanne_svabody_merkavanniau.pdf

**грамадзянскай супольнасці**. Па стане на канец кастрычніка 2023 года згодна з маніторынгам, які вядзецца Lawtrend, ліквідаваныя або знаходзяцца ў стадыі ліквідацыі 1 457 некамерцыйных арганізацыяў (931 знаходзяцца ў працэсе прымусовай ліквідацыі і 526 — у працэсе самаліквідацыі).[48]

Спалучэнне абмежавальнага заканадаўства, палітычнай волі і рэпрэсіўнай практыкі выкарыстоўваецца як магутны інструмент, каб прымусіць людзей пакінуць краіну.[49] Паводле розных ацэнак, **ад 200 да 500 тысяч чалавек былі вымушаныя пакінуць Беларусь** пасля 9 жніўня 2020 г.[50] і цяпер, у выніку новых зменаў заканадаўства, пазбаўленыя магчымасці ўплываць на палітыку дзяржавы.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года ва ўладаў ужо ёсць вопыт правядзення агульнарэспубліканскай выбарчай кампаніі — рэферэндум па змене Канстытуцыі, праведзены 27 лютага 2022 года ва ўмовах сістэмных і масавых парушэнняў правоў чалавека, прававога крызісу, умацавання аўтарытарызму і напружанай сітуацыі ў рэгіёне ў сувязі з развязанай Расійскай Федэрацыяй вайной супраць Украіны. **Падрыхтоўка і правядзенне рэферэндуму не адпавядалі асноўным міжнародным стандартам правядзення свабодных і сумленных электаральных кампаній і суправаджаліся шматлікімі парушэннямі.** Галасаванне адбывалася непразрыста, без удзелу незалежных назіральнікаў, а вынікі не могуць быць прызнаныя рэальным волевыяўленнем грамадзян.[51]

Да моманту абвяшчэння выбараў*2024, улады стварылі атмасферу татальнага страху, што падтрымліваецца адміністрацыйным самавольствам. Усе тры гады пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года рэжым планамерна выпустошваў грамадска-палітычную прастору, не пакінуўшы магчымасцяў для здаровай палітычнай дыскусіі і рэальнай палітычнай

---

[48] Lawtrend, Мониторинг НКО в Беларуси, находящихся в процессе принудительной ликвидации и принявших решение о самоликвидации: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/situatsiya-so-svobodoj-assotsiatsij-i-organizatsiyami-grazhdanskogo-obshhestva-respubliki-belarus-obzor-za-oktyabr-2023-g

[49] Даклад Спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Анаіс Марэн, A/77/195: https://documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/N22/432/95/PDF/N2243295.pdf?OpenElement

[50] Belarusians in exile: an overlooked issue addressed by the Parliamentary Assembly: https://pace.coe.int/en/news/8955/belarusians-in-exile-an-overlooked-issue-addressed-by-the-parliamentary-assembly

[51] Выніковая аналітычная справаздача экспертнай місіі па ацэнцы рэспубліканскага рэферэндуму, с. 4: https://spring96.org/be/news/107872

барацьбы ў выбарчай кампаніі. Праз палітычныя рэпрэсіі любая несанкцыянаваная вертыкаллю ўлады ініцыятыва ўдзелу ў выбарчай кампаніі 2024 года будзе азначаць высокую рызыку палітычна матываванага крымінальнага пераследу. Існуючыя сродкі прававой абароны па-ранейшаму неэфектыўныя нават у дачыненні да паведамленняў пра факты катаванняў; адсутнічаюць гарантыі незалежнасці судоў, прадказальнасці ў правапрымяняльнай практыцы. Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі з'яўляецца крытычнай, у такіх умовах немагчыма казаць пра выбары*2024 як пра свабодныя, справядлівыя і дэмакратычныя.